Ёсць і майстры, якія не бачаць сэнсу ва ўступленні ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці: “Не, неяк так мне няма у гэтым асаблівай патрэбы. Быў пэўны час, калі мяне трошкі падбівалі, калі я была на Магілёўшчыне. Мне самая галоўная задача - відзець ад людзей, з якімі я камунікую, которыя бачаць, набываюць, ці проста могуць ацаніць – гэта самае галоўнае меркаванне, а пасведчанне нейкае… Так я і так рамеслініца – падаткі плачу! Хаця усе можа быць” (В. Ж.).

Такім чынам, на Навагрудчыне захоўваюцца мясцовыя рамесныя традыцыі, якія падтрымліваюцца з боку дзяржавы, асабліва праз дзейнасць Аддзела рамёстваў, творчых аб’яднанняў, Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Вялікая ўвага надаецца захаванню і пераемнасці традыцый, да якіх далучаюцца як дзеці, так і дарослыя. У майстроў Навагрудчыны тут ёсць добрыя перспектывы. Зараз, калі мясцовыя ўлады актыўна працуюць над адраджэннем турыстычнага патока ў рэгіён, у майстроў з’явілася магчымасць далучыцца да гэтага працэсу.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Новогрудский отдел ремесел // ГУК «Новогрудский районный центр культуры и народного творчества» URL: https://nov-centr.of.by/novogrudskij-otdel-remesel / (дата доступа: 21.09.2025).

**В. А. Міхедзька**

## ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАГА САМАДЗЯРЖАЎЯ І ПРАВАМАНАРХІЧНЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ СІЛЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX –ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Праваманархічныя сілы фармаваліся у Беларусі ў самым канцы XIX – пачатку XX ст. і вызначыліся, акрамя ўласна кансерватыўных грамадска-палітычных пазіцыяў, у дачыненні да грамадскага і дзяржаўнага ўладкавання, але, перад усім, выразным і жорсткім нацыяналізмам.

Кансерватыўна-манархічная думка была дастаткова арганічнай і натуральнай часткай рускага грамадства, перад усім сталічных і універсітэцкіх асяродкаў, і адной з найбольш вызначальных рысаў яго быў рускі вялікадзяржаўны нацыяналізм, артадаксальнае праваслаўе. На пачатку XX ст. яна абапіралася на асяродкі інтэлектуалаў, перад усім з універсітэцкіх і літараурных асяродкаў, а таксама і на землеўладальніцкія колы, у тым ліку з радавітай арыстакратыі. Расійская манархія мусіла прыстасоўвацца да росту нацыяналістычных настрояў у рускім грамадстве (ды і ўвогуле ў свеце) і імкнулася выкарыстаць іх дзеля ўмацавання ўласных пазіцыяў. Гэтаму збліжэнню улады і грамадства моцна садзейнічалі паўстанне 1863 г., якое выразна разумелася рускім грамадствам як паўстанне польскае, а таксама руска-турэцкая вайна 1877–1878 гг. і вызваленне паўднёвых славян і, дарэчы, забойства Аляксандра II, у якім зноў убачылі “польскую інтрыгу”. Імкненне манархіі выкарыстаць нацыяналістычныя ідэялагемы вызначыла фармаванне пры Аляксандры III афіцыйнай нацыяналістычнай палітыкі, якая ў згаданых умовах мела хутчэй рэактыўны характар. Адказам на развіццё нацыянальных памкненняў падуладных народаў сталася ўзмацненне “абмежавальнага” заканадаўства. Значны ўнёсак у яго належаў Міхаілу Мураўёву, чые выразна нацыяналістычныя дзеянні атрымалі прыхільнікаў у асяроддзі перадусім разначыннай рускай інтэлігенцыі. Урадавыя мерапрыемствы на працягу другой паловы XIX ст. перадвызначылі адсутнасць у краі вялікіх магчымасцяў для фармавання праваманархічнага асяроддзя. Польскія і спаланізаваныя землеўладальнікі ў Беларусі, за невялікімі выключэннямі, былі хутчэй апазіцыйным да расійскай улады. Вельмі істотная для сталіц – Масквы, Санкт-Пецярбурга і ўніверсітэцкіх гарадоў крыніца папаўнення кансерватыўнага асяродка –

студэнцтва і прафесура – тут адсутнічала. Ва ўмовах шматэтнічнай і шматканфесійнай Беларусі, асяродкі расійскай культуры яшчэ на пачатку ХХ ст. былі хутчэй астраўкамі, моцна залежнымі ад улады, якія непасрэдна фармаваліся гэтай уладай, вылучэнне праваманархічнай плыні з'яўлалася тут не столькі вынікам ідэалагічнай дыферэнцыяцыі, колькі непасрэднай праекцыяй урадавай палітыкі. У той жа час, высветлілася і прынцыповая неадпаведнасць палітыкі афіцыйнага нацыяналізму саслоўнаму ладу Расійскай імперыі. Гэтая акалічнасць вызначыла ўнутраную супярэчнасць і непаслядоўнасць урадавай палітыкі у Беларусі і іншых “ускраінах” да канца існавання імперыі. Урад мусіў ісці на парушэнне саслоўнага прынцыпу, на абмежаванні ў прававой, гаспадарчай, культурнай сферах дзеля паслаблення мясцовых элітаў і замацавання тым самым расійскай дамінацыі ў краі. Штопраўда, замахі на саслоўныя і маёмасныя падмуркі імперыі, чым з’яўляліся мерапрыемствы Мураўёва, выклікалі спрэчкі і ўнутраную барацьбу ў вышэйшых колах саноўнага Пецярбурга (дарэчы, вельмі стракатых па этнічным паходжанні і канфесійнай прыналежнасці). Урэшце, гэта і вырашыла ціхі кар'ерны скон Мураўёва, але не перашкодзіла надалей прыняццю шэрагу дыскрымінацыйных захадаў, перад усім у галіне землеўладання. Аднак, гэтыя абмежаванні ўжо не абвяргалі саслоўныя і маёмасныя прынцыпы грамадскага ўладкавання. Цікава, што гэтыя мерапрыемствы былі арыентаваныя менавіта не столькі на забяспячэнне прэферэнцыяў расійскаму элементу ў краі, але на стварэнне перашкодаў для нерасійскага. Тым не менш, на рубяжы XIX –XX стст. прыблізна палова прыватнаўласніцкіх земляў належалі ў Беларусі асобам “польскага паходжання”, што забяспечвала ім моцныя пазіцыі як у самім краі, гэтак і ўплыў на пецярбургскую палітыку [1, с. 85–86]. У пачатку ХХ ст. лаялісцкія настроі вярхоў мясцовага польскага грамадства на фоне палітычнага індэферэнтызму яго сярэдніх слаёў былі відавочныя. П. Дз. Святаполк-Мірскі ў дакладзе Мікалаю ІІ у траўні 1904 г. адзначаў сацыяльны кансерватызм польскіх землеўладальнікаў і, пры захаванні пэўных нацыянальна-культурных памкненняў, іх жаданне да пагаднення з расійскай уладай. Такое ж самае бачанне сітуацыі ў краі дэманстраваў у сваёй справаздачы за 1903г. віленскі губернатар К.К.Пален. Палякі, на ягоны погляд, “не уяўляліся небяспечнымі… схільныя да кансерватыўных поглядаў…шукаюць апірышча ва ўрадзе” [2, арк. 3 адв. – 5 адв.]. Найбольшую заклапочанасць адміністрацыі у гэты перыяд выклікала імклівае развіццё сацыяльнага вызваленчага руху у асяроддзі яўрэйскіх рабочых і рамеснікаў. Святаполк-Мірскі заўважаў, што мясцовыя улады на працягу другой паловы XIX ст. засяроджвалі ўсе сілы на змаганні супраць польскага палітычнага руху і зусім выпусцілі з поля зроку развіццё яўрэйскага насельніцтва. Між тым, як працягваў генерал-губернатар, узровень рэвалюцыйнага руху сярод палякаў не мог быць параўнаны з яго размахам у яўрэйскім асяроддзі. [3, арк. 100]. Адзначыўшы відавочную перавагу сацыяльнага пратэсту над нацыянальным, генерал-губернатар заклікаў урад абаперціся на лаяльныя кансерватыўныя элементы ўсіх нацыянальнасцяў краю. Але ягоныя прапановы не былі пачутыя.

Значна больш магчымасцяў было для русіфікацыйнай культурна-моўнай палітыкі – “ачышчэння рускай нацыянальнай глебы ад ... польскай цывілізацыі” [4, с. 122]. Ажыццяўленне яе адбывалася высілкамі як мясцовай "заходнерускай" разначыннай інтэлігенцыі, гэтак у значнай ступені прыбылым з унутраных губерняў чыноўніцтвам. На працягу другой паловы XIX – пачатку ХХ ст. урадавая палітыка у дачыненні да польскага, яўрэйскага і ўвогуле да неправаслаўнага насельніцтва, разам з мерапрыемствамі па русіфікацыі краю стварыла супярэчлівую сістэму сацыяльнай, саслоўнай і этнаканфесійнай ерархіі. На рубяжы стагоддзяў, калі не лічыць вайсковую прысутнасць, якраз гэтае чыноўніцка-інтэлігенцкае асяроддзе, якое само дзялілася па сацыяльна-эканамічных, этнакультурных і саслоўных прыкметах, было бадай што адзінай сапраўднай апорай расійскай манархіі ў краі. Адданасць расійскай уладзе і абарона тут яе інтарэсаў забяспечвалася цэлым комплексам фактараў. Зразумела, што для розных груповак гэтага асяроддзя адрозніваліся і мэты і падставы гэтай адданасці, паміж імі існавалі і істотныя супярэчнасці [5, с. 270–272, 278–287]. У пачатку ХХ ст., асабліва на фоне разгортвання вызваленчага руху, у гэтым асяроддзі вель-

мі папулярнай заставалася асоба М. Мураўёва, вельмі распаўсюджаныя былі паланафобія і антысемітызм. Мясцовае польскае і яўрэйскае грамадства разглядаліся не толькі як аб'ект дзеянння абмежавальнага заканадаўства, але і як пагроза непадзельнаму расійскаму панаванню. Спробы пагаднення з польскім грамадствам, заклікі да змякчэння дыскрымінацыі яўрэйскага насельніцтва, якія зыходзілі ад пецярбурскіх бюракратаў-прагматыкаў кшталту С. Віттэ, ці такіх мясцовых адміністратараў як П. Дз. Святаполк-Мірскі, выклікалі у гэтым асяроддзі рэзкае непрыняцце. Тут, па словах высокага чыноўніка МУС, "усю прычыну крамолы бачылі у іншародцах – паляках і жыхарах рысы яўрэйскай аселасці" [6, с. 426].

Варта адзначыць, што пры відавочнай карэляцыі антысеміцкіх і паланафобскіх настрояў яны не заўсёды зліваліся у адзіны ксенафобскі погляд. Так, для правых манархічных асяродкаў усходніх беларускіх губерняў было характэрным у перыяд да пачатку дзейнасці Дзяржаўнай Думы перавага антысеміцкага накірунку, у той час як антыпольскія былі на другім плане. Для цэнтра і захада Беларусі, дзе польская грамадска-палітычная актыўнасць была больш заўважная, адпаведна антыпольскія настроі былі мацнейшыя. Эскалацыя антыпольскіх настрояў адбылася з пачаткам дзейнасці Дзяржаўнай Думы, калі польскі грамадска-палітычны рух істотна узмацніўся. Дакументальныя матэрыялы, якія адлюстроўваюць светапогляд і дзейнасць правых манархістаў у Беларусі, паказваюць, што абарона расійскай манархіі для абсалютна пераважнай іх часткі была толькі арганічным і, зрэшты, несамадастатковым элементам іх змагання за прывелеі "рускай народнасці", у той час як для мас беларускага сялянства і мяшчан манархізм быў відавочна вызначаны патрыярхальнай традыцыяй.

### Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

2. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1284. Оп. 194. Д. 52.

3. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1284. Оп.194. Д. 136.

4 Крыжановский, С. Е. Заметки русского консерватора / С. Е. Крыжановский // Вопросы истории. – 1997. – №4. – С.107–126.

5. Цвікевіч, А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX в. / А. Цвікевіч. – 2-е выд. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 352с.

6. Материалы к истории русской контр-революции. – СПб. : Тип. т-ва "Общественная польза", 1908. - Т. I : Погромы по официальным документам. –1908. – 451 с.



**Н. С. Моторова**


## ОЦЕНКА ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОРГАНОВ ГОРОДСКОГО САМОУПРАВЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ ВО ВСЕПОДДАННЕЙШИХ ОТЧЕТАХ ГУБЕРНАТОРОВ (ПЕРВАЯ ПОЛОВИНА 1880-Х ГОДОВ)

Реформа системы городского самоуправления являлась одним из важнейших элементов либеральных преобразований Александра II. Ее основные принципы были изложены в Городовом положении 1870 г.

Однако в белорусских губерниях городская реформа началась лишь в 1875 г. и растянулась практически на 17 лет. Это было связано с тем, что формирование списков избирателей и организация выборов в новые органы местного самоуправления потребовали длительной подготовки. Так, в 1875 г. по разрешению министра внутренних дел новое Городовое положение было введено в Витебске, Минске, Пинске, Могилеве, Гомеле, Гродно (однако городские общественные управления начали здесь функционировать с 1876 г.) [1, л. 555 об.;